# РЭЦЭНЗІІ

**НЕАРДЫНАРНАЯ З’ЯВА
НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫКАНАЛЬНІЦКАГА АДРАДЖЭННЯ**

**Гром У.М, Крамко А.Я., Мангушаў І.А. Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах. Ч. 1: Сольнае выкананне: Вучэб.-метад. дапам. – Мн.: Бел. дзяр. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – 259 с.**

**Гром У.М., Крамко А.Я., Мангушаў І.А. Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах. Ч. 2: Ансамблевае выкананне: Вучэб.-метад. дапам. – Мн.: Бел. дзяр. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – 217 с.**

Унікальным падарункам да 30-годдзя існавання БДУ культуры і мастацтваў, а таксама і прыхільнікам нацыянальнага народна-інструментальнага мастацтва Беларусі з’яўляецца выданне фундаментальнай “Школы ігры на беларускіх народных духавых інструментах” у двух частках.

Выхад гэтай працы ў свет – з’ява неардынарная. Адзначым, што ў гісторыі культуры беларускага народа нацыянальныя народныя духавыя музычныя інструменты выконвалі і сёння выконваюць значную ролю. Іх бытаванне, канструктыўнае ўдасканаленне і функцыянальнае пашырэнне прымнажаюць дасягненні народных музыкаў, дазваляюць захаваць і развіваць нацыянальныя выканальніцкія традыцыі, пазнаёміць з іх асаблівасцямі як саміх беларусаў, так і прыхільнікаў народна-інструментальнай творчасці замежных краін. Але, на жаль, нягледзячы на багатыя мастацкія традыцыі выканальніцкага майстэрства ігры на народных беларускіх духавых інструментах у гісторыі іх развіцця былі і сумныя з’явы. Напрыклад, у канцы XIX ст. такі самабытны і унікальны музычны духавы інструмент беларусаў, як дуда, паступова выходзіў з выканальніцкай практыкі і ўжо стаў лічыцца зніклым. І толькі дзякуючы пошукам апантаных энтузіястаў па рэканструкцыі, вырабе і папулярызацыі беларускіх народных духавых інструментаў, толькі дзякуючы адражэнню гістарычнай памяці аб нацыянальна-выканальніцкіх дасягненнях у гэтым кірунку, каларытна-санорныя, пяшчотна-чароўныя беларускія народныя духавыя музычныя інструменты актыўна вяртаюцца ў нацыянальную культуру, займаюць сваё пачэснае месца. Сёння яны – не фонава-выпадковыя, экзатычна-эпізадычныя “фольк-з’явы”, а выпакутавана захаваныя нацыянальна-мастацкія сімвалы і паўнацэнныя транслятары музычнай спадчыны Беларусі, састаўныя кампаненты матэрыяльнай і духоўнай нацыянальнай культуры. Вялікая заслуга ў гэтым працэсе належыць супрацоўнікам навукова-творчай лабараторыі беларускіх народных музычных інструментаў БДУ культуры і мастацтваў.

У выніку намаганняў па рэканструкцыі, вырабе беларускіх народных духавых музычных інструментаў, іх папулярызацыі нарадзілася і цудоўная ідэя стварэння сапраўднай нацыянальнай школы ігры на народных духавых інструментах. Гэта ідэя была вельмі своечасовая, тым больш, што першая падобная спроба не адпавядала рэчаіснасці, неабходнаму ўзроўню і патрабаванням да падобных выданняў (маецца на ўвазе “Лірнік” У.Пузыні). Таму ініцыятыўнай групай былі абмеркаваны асноўныя кірункі па стварэнні гісторыка-дакладнай, мастацкай і творча-апрабаванай працы, прапанаваны аўтарскі калектыў, а таксама вызначаны задачы, прынцыпы кампаноўкі матэрыялу і яго тэматычнае размяшчэнне. З пастаўленымі задачамі аўтары Школы... выдатна справіліся.

У першай частцы Школы..., якая прысвечана сольнаму выкананню, пасля прадмовы выкладаюцца асновы гукаўтварэння на беларускіх народных духавых інструментах, даюцца звесткі па выканальніцка-выразных сродках – штрыхах, мелізмах. Наступныя раздзелы знаёмяць з музычнымі інструментамі на аснове прынятай у свеце тыпалогіі (сістэма нямецкіх арганолагаў Эрыха фон Хорнбастэля – Курта Закса) і спрошчанай класіфікацыі (сістэма бельгійскага арганолага Віктора Шарля Маёна). Адзначым, што для ўсіх груп інструментаў даюцца аплікатурныя табліцы, а таксама табліцы з указаннем тэхнічна-выканальніцкіх магчымасцей інструментаў: строй, дыяпазон, натацыя. Для авалодання тэхнікай ігры на інструментах ва ўсе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раздзелы ўключаны спецыяльныя практыкаванні і эцюды з улікам выканальніцкіх цяжкасцей. А для ўдасканалення выканальніцкага майстэрства, фарміравання музычнага густу, засваення музычнай формы ў Школе... прапануюцца аўтарскія творы А.Крамко, І.Мангушава, а таксама апрацоўкі беларускіх песенных і танцавальных мелодый, больш за восемдзесят з якіх зрабіў У.Гром.

Першы раздзел прысвечаны *свістковым інструментам.* Для ігры на дудцы прапануюцца апрацоўка беларускага народнага танца "Верабей", "Вясельны марш", "Янка-полька"; апрацоўкі беларускіх песенных мелодый "Ох, і сеяла Ульяніца лянок", "Ехаў Ясь на кані", "А ў бары зязюлька кукуе", "Гусанька" – для парных дудак. Цікавыя народныя песенныя мелодыі рэкамендуюцца для поршневай дудкі ("Зорка Венера", "Ты запей, запей, жавароначак", "Шумныя бярозы" і інш), а таксама для акарыны ("Ці ўсе лугі пакошаны", "О, не кукуй, зязюленька, рана", "Сядзіць галубок над крыніцаю" і інш.).

Наступны раздзел прысвечаны *язычковым інструментам* (жалейка, саломка, дуда). З твораў, якія прапануюцца для ігры на гэтых інструментах, адзначым танцавальныя ("Скакуха", "Карагод", "Акуліна") і песенныя ("Там, каля млына", "Ой, за гаем, гаем", "Камары гудуць") – для жалейкі; танцавальныя ("Лявоніха па-даўнейшаму", "Юрачка", "Кругавая", "Шастак") і песенныя ("Мой міленькі памёр", "Саўка ды Грышка" і інш.) – для дуды, а беларускія народныя песенныя найгрышы "Ой, лета ж маё, лета", "Дзякуем табе, наш моцны Божа", "Восень" і інш. – для саломкі.

Матэрыял раздзела *"Амбушурныя інструменты"* прапануецца для асваення такіх інструментаў, як труба і рог. На прыкладзе аўтэнтычных сігналаў і песенных найгрышаў ("Раніцай", "Выган кароў", "Вясна", "Дадому", "Я табун сцерагу") навучэнцы здольны засвоіць традыцыйнае выканаўства на трубе. А тыя, хто паспрабуе пазнаёміцца са старажытным інструментам – рогам, атрымае асалоду пры выкананні такіх каларытных прыкладаў музычнай народнай спадчыны, як "Зоў сабак", "Як завуць кароў", "Як пасуць кароў" і інш.

Характэрнай рысай першай і другой частак Школы... з'яўляецца тое, што і практыкаванні, і музычныя прыклады, і эцюды грунтуюцца на галоўным дыдактычным прынцыпе – ад простага да складанага, ад невядомага да ўжо вядомага. Таму не выпадкова аўтары прапанавалі аб'яднанне пэўнага музычнага матэрыялу ў такі раздзел, як "Творы для дудкі, жалейкі, акарыны і трубы з фартэпіяна", які ўключае і апрацоўкі беларускіх мелодый, і аўтарскія творы. У гэтым раздзеле навучэнцы, спецыялісты з задавальненнем пазнаёмяцца з такімі творамі А.Крамко, як раманс "Я не забуду Вас" – для дудкі, "Развітанне з летам", "На адпачынку" – для жалейкі, "Накцюрн", "Тарантэла" – для акарыны, яго ж апрацоўкамі танцавальных мелодый ("Вясковая полька", "Кадрыля") і апрацоўкамі песенных мелодый, як, напрыклад, "Гыля, гыля, шэрыя гусі"– для дудкі. Для жалейкі і дудкі ў гэтым жа раздзеле прапанаваны "Гавот-пастараль" І.Мангушава і іншыя яго творы: "Правады лета" – для драўлянай трубы; "Забаўлянка", "Роздум" – для акарыны.

Выданне першай часткі Школы... адразу пацвердзіла яе значнасць і запа- трабаванасць. Зараз выкладчыкі кафедры духавой музыкі БДУ культуры і мастацтваў завяршаюць працу над тыпавой вучэбнай праграмай для студэнтаў па авалоданні беларускімі народнымі духавымі інструментамі ў адпаведнасці з паслядоўнасцю выкладання матэрыялу ў першай частцы Школы...

А вось змест другой часткі Школы... адпавядае ўжо выдадзенай тыпавой праграме (яна распрацавана А.Карацеевым, А.Караткевічам, І.Мангушавым). Другая частка Школы... прысвечана больш значнай форме выканальніцкага майстэрства – ансамблеваму выкананню. Тут змяшчаюцца парады па рабоце з ансамблямі беларускіх народных духавых інструментаў, метадычныя парады па рабоце над творамі, даюцца параўнальныя табліцы аплікатуры, дыяпазону, строю, натацыі інструментаў, распрацаваных У.Громам (сярод інструментаў – дудкі, акарыны, дуды, жалейкі).

Адзначым, што музычныя творы разлічаны як на розныя формы, так і на розныя склады ансамбляў і грунтуюцца на асноўных дыдактычных прынцыпах навучання. Усім тым, каму адрасавана Школа..., цікава будзе пазнаёміцца з такімі творамі, як "У нашым сяле свадзьба будзе", "Каціласяя чорна галка" для дуэта дудак у апрацоўцы У.Грома, "Зязюленька" І.Мангушава для трыо дудак, "Дудары" Я.Глебава з "Палескай сюіты" ў інструментоўцы А.Крамко для квартэта дудак і інш.

Уключаныя ў Школу... творы садзейнічаюць пашырэнню канцэртнага рэпертуару як аматарскіх выканаўцаў, так і прафесійных музыкантаў. Пераканаўчыя прыклады таму – апрацоўка У.Громам мелодыі "А ў полі жыта не ярыцца" для квінтэта акарын, чароўна-пяшчотны, фантастычна-казачны твор А.Крамко "Гліняная цацка" і яго ж эмацыянальна захапляльная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“Жартоўная уверцюра” для квінтэта жалеек. У “Сюіце для чатырох драўляных труб” (часткі “Старажытная фанфара”, “Рана сонейка ўзышло”, “Купальскае шэсце”, «Весялуха”) аўтар І.Мангушаў упершыню адышоў ад традыцыйнай рэпліка-сігнальнай трактоўкі гэтых старажытных інструментаў і здолеў аб’яднаць чаргаванне іх натуральных абертонаў у сольна-эпізадычныя меладычныя папеўкі. У творы віртуозныя сігналы ў кадэнцыях выконваюцца штрыхом portamento, меладычнае голасавядзенне – пры акордавым суправаджэнні і голасавядзенні.

Не выклікае сумнення тое, што ў гэтага твора доўгае канцэртнае жыццё.

Асобнае месца ў Школе... належыць такому арыгінальнаму твору буйной формы, як сюіта І.Мангушава “Галасы мінуўшчыны” ў сямі частках, дзе аўтар творча эксперыментуе не толькі з рознымі інструментамі, але і лагічна аб’ядноўвае іх у аднародныя саставы (частка “Водгукі стагоддзяў” для драўляных труб) ці па роднасці інструментаў (частка “Ранішні харал” для квартэта акарын; частка “Баль у маётку Агінты” для квартэта дудак). Для змешаных складоў ансамбляў прызначаны часткі “На Грунвальд”, “Святочны паланэз”, “Гавот-пастараль” і “Скакуха”. Кампаноўка матэрыялаў музычна-вобразных знаходак, іх каларытна афарбаваная інструментоўка І.Мангушавым менавіта ў гэтых частках дазваляе канстатаваць незвычайную з’яву ў стварэнні аргінальных твораў для народна-духавога выканаўства Беларусі. Сказанае сведчыць аб магчымасці нацыянальнага народна-духавога інструментарыя дасягнуць значнага ўзроўню капэльнага tutti. А такі творчы падыход і новы кірунак стварэння рэпертуару для яго канцэртнага ўвасаблення ў вышэйшай ступені гарантуюць народным духавым інструментам Беларусі аўтарытэт на канцэртных пляцоўках, адкрываюць для іх перспектыўныя шляхі канкурэнтназдольнага канцэртнага жыцця і стварэння новых, ансамблева кантрастных, арыгінальных капэльных нацыянальных традыцый у духавым мастацтве.

Неабходна дадаць, што многія з твораў, уключаных у Школу..., нараджаліся ў эксперыментальных пошуках навукова-творчай лабараторыі беларускіх народных музычных інструментаў БДУ культуры і мастацтваў. Яны апрабаваліся і ў канцэртнай дзейнасці, і конкурсных спаборніцтвах капэлы беларускіх народных духавых інструментаў “Гуды” (мастацкі кіраўнік У.Гром, музычны кіраўнік І.Мангушаў), ансамбля беларускіх народных духавых інструментаў “Carduus” (мастацкі кіраўнік І.Мангушаў). Нагадаем, што некаторыя названыя вышэй канцэртныя творы аўтараў Школы... былі запісаны капэлай “Гуды” на аўдыёкасету фірмай “Ковчег” у 2001 г., а таксама ўключаны ў спецыяльны тэлефільм аб дзейнасці ансамбляў “Гуды”, “Carduus” на тэлеканале “Лад” у 2004 г., тэлеперадачу “Спявай, душа” аб удзеле названых калектываў на міжнародным фестывалі народнай музыкі “Звіняць цымбалы і гармонік” у 2005 г.

Значнасць матэрыялаў і першай, і другой частак “Школы ігры на беларускіх народных духавых інструментах” заключаецца ў тым, што яны не толькі забяспечаць вучэбна-педагагічны працэс па падрыхтоўцы выканаўцаў на гэтых інструментах, але і зацікавяць аматарскіх і прафесійных выканаўцаў, прафесійных кампазітараў і аўтараў апрацовак, інструментовак, карацей кажучы, усіх тых, хто ў сваёй творчай дзейнасці звяртаецца да унікальнага каларыту самабытнага беларускага народнага духавога інструментарыя.

Выданне Школы... – гэта сапраўдная перамога аўтараў над скептыцызмам тых, хто разважае аб “прымітывізме”, “архаічнасці” нацыянальнай музычна-інструментальнай духавой спадчыны. Выданне Школы... – гэта і сапраўднае свята для ўсіх, хто ўлюбёны ў этнакаларыстычную самабытнасць народнага духавога інструментарыя, хто плённа працягвае традыцыі выканальніцкага майстэрства і ўпэўнена крочыць па шляху гэтага кірунку, хто ўпэўнены ў перспектывах запатрабаванасці мастацкага багацця народнага духавога інструментарыя Беларусі.

***А.Л.Карацееў,*** *кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ